ПРАЦОЎНАЯ
САЛІДАРНАСЦЬ

*Газета для рабочых* *№1(7) студзень 2010 г.*

# Вынікі мінулага году

Першы год крызісу моцна адбіўся на ўсёй эканоміцы Беларусі і на нашым заводзе ў прыватнасці. Калі назваць усе праявы крызісу на шклозаводзе "Нёман" адным словам, то гэта будзе "скарачэнне".

**Скарачэнне аб'ёмаў вытворчасці.**

У выніку таго, што падчас крызісу пакупнікам не да шкляных і крышталёвых вырабаў, прадукцыя завода пачала кепска рэалізоўвацца. А праца на склад – вельмі неэфектыўная эканамічна, бо не толькі не дае прыбыткаў, а нават не дазваляе вяртаць выдаткі на вытворчасць. Таму кіраўніцтвам прадпрыемства і быў ужыты такі непапулярны, але дзейсны сродак, як скарачэнне аб'ёмаў вытворчасці. Яшчэ на пачатку года, а дакладней у сакавіку, планавалася перавесці на 4-хгадзінны працоўны дзень дзве крышталёвыя печы, але калектыўны зварот працоўных тады сарваў намеры адміністрацыі – начальства было не гатовае да такога развіцця падзеяў, і таму загад быў адменены. Выявілася і хлуслівасць кіраўніцтва: печ № 12 хацелі зліць, бо, нібыта, яна "ў аварыйным стане", але ж ніякага аварыйнага стану і блізка не было, інакш яе і сапраўды патушылі б.



Затое ўсе адміністратыўныя службы былі пераведзеныя на няпоўны рабочы дзень, і працуюць у такім рэжыме і да сёння. Ну, яны знаходзяцца ў значна горшым прававым становішчы: калі рабочыя могуць сабе дазволіць выказваць незадаволенасць і нязгоду з дзеяннямі кіраўніцтва, то ІТРаўцы вымушаныя маўчаць і падпарадкоўвацца, інакш – застанешся без працы.

**Скарачэнне заробкаў.**

Не гледзячы на запэўніванні кіраўніцтва, што нібыта заробкі на прадпрыемстве не толькі не зменшыліся, але наадварот павялічыліся, такія сцверджанні выклікаюць у працоўных толькі сумныя ўсмешкі. Як можа павялічыцца рэальны заробак, калі працуеш па скарочаным графіку?

Але, калі верыць начальству, то можа! Як гаворыцца, хто лічыць, той і мае. Калі ўзяць сярэдні заробак за гадзіну, ды памножыць на тую колькасць гадзін, якую рабочыя павінны былі б адпрацаваць пры поўнай занятасці, вынік атрымаецца такі, які трэба для статыстыкі.

А вось з сярэднім заробкам па заводзе сітуацыя яшчэ мудрэйшая. Ён, як вядома, разлічваецца проста: сума ўсіх заробкаў дзеліцца на колькасць работнікаў. Але тут ёсць цікавы момант: колькасць работнікаў у сферы вытворчасці зменшылася (пра гэта – ніжэй), а вось колькасць розных кіраўнічых пасадаў нават павялічылася. (Дзіўна, як гэта папярэднія дырэктары нашага заводу абыходзіліся двума намеснікамі? У сённяшняга дырэктара іх, здаецца, 6 ці 7.) І вось, калі, напрыклад, узяць заробак намесніка дырэктара (каля 2,5 млн.рублёў) і трох укладчыц (па 500 тыс.рублёў), атрымаем сярэдні заробак: 2 500 000+(3*500 000)/4=1 000 000. Сярэдні заробак – мільён! І чаго вы хочаце? Лічбы, канешне, прыблізныя, але схема такая.

Так што, статыстыка ў нашай краіне заўсёды лепшая за рэальнасць.

**Скарачэнне працоўных месцаў.**

Усе клятвы і заявы кіраўніцтва (і мясцовага, і вышэйшага) пра тое, што галоўная задача – захаванне працоўных месцаў і стварэнне новых, выявіліся , мякка кажучы, крывадушнымі. Толькі на нашым заводзе (па афіцыйных дадзеных) за мінулы год звольнена больш за 500 чалавек (прынята на работу менш за 100). Найбольш людзі звальняліся па ўласным жаданні і па дамоўленасці бакоў. Чаму? Пэўна ж, не ад добрага жыцця і прыстойных заробкаў. Звальняюцца, як правіла, маладыя людзі, яны больш мабільныя, ды й патрабаванні ў іх большыя. Калі гэтая тэндэнцыя захаваецца, праз 5-7 гадоў на заводзе застануцца працаваць толькі пенсіянеры і людзі перадпенсійнага веку. Маладых спецыялістаў будзе не хапаць. І хто тады будзе працягваць майстэрскія традыцыі? Гэтае пытанне, відаць, нікога не хвалюе.

Падводзячы рысу, можна сцвярджаць, што мінулы год быў ці не найгоршым для нашага прадпрыемства за апошняе дзесяцігоддзе. Але ж і надыйшоўшы год, у святле апошніх падзеяў, прымушае ставіцца да будучыні з насцярогай. Хто ведае, што нас чакае, пры нашай-та "стабільнасці"?

***П.Кілішкевіч***

# Гэты год будзе больш складаным
## (прагноз незалежнага эканаміста)

Для беларускай эканомікі 2010 год будзе больш складаным, чым мінулы, заявіў 29 студзеня на прэс-канферэнцыі ў Брэсце эканаміст Яраслаў Раманчук.

- Я лічу, будзе падзенне ВУП, заробкаў грамадзян. Яшчэ больш будзе праблем у банкаў і прадпрыемстваў. І нават калі нам дадуць грошы і кітайцы, і МВФ, і Расія, гэта будзе толькі праяданнем грошай, што яшчэ больш зацягне нас у пазыковую пастку, — сказаў Раманчук.

Паводле яго меркавання, урад не прыняў мер, якія рэальна дапамогуць краіне выйсці з крызісу. "Дзяржава паказала сябе як неэфектыўны інвестар, неэфектыўны ўласнік", — лічыць эканаміст.

Раманчук заявіў, што ў 2010 годзе "будуць надзімацца новыя бурбалкі ў эканоміцы, частка якіх ужо пачне здзімацца".

У прыватнасці, лічыць Раманчук, не будзе хапаць грошай з бюджэту для малых і сярэдніх прадпрыемстваў, невялікіх гарадоў. "Мясцовыя бюджэты пазбаўлены прыбытковай базы, таму яны ў першую чаргу будуць адчуваць дэфіцыт рэсурсаў. Да жыхароў рэгіёнаў не будуць даходзіць добрыя канкурэнтныя тавары, яны першымі могуць адчуць затрымкі заработнай платы і пенсій", — сказаў Раманчук.

Акрамя таго, на яго думку, калі Нацыянальны банк будзе рабіць тое, што абяцае ў Асноўных кірунках грашова-крэдытнай палітыкі, "то гэта будзе актыўнай працай грашовага друкарскага станка". "Лічбы паказваюць, што ў лістападзе-снежні гэты станок ужо актыўна ўключылі", — заявіў Раманчук, паведамляе БелаПАН

---

# Чаму падвышаюць нормы?

Гэтае пытанне хвалюе многіх працоўных, у першую чаргу тых, хто непасрэдна заняты на вытворчасці. Зазвычай рабочыя негатыўна ўспрымаюць такія меры кіраўніцтва, бо яны цягнуць за сабой пагаршэнне ўмоваў працы.

Але давайце спачатку разгледзім гэтую праблему з пункту гледжання заканадаўства. Вось што пра гэта напісана ў Пастанове Міністэрства працы і сацыяльнай абароны РБ ад 21 сакавіка 2008 г. за №53 (цытата): *“Устаревшими считаются нормы, действующие на работах, трудоемкость которых уменьшилась в результате общего улучшения организации производства и труда, роста профессионального мастерства и совершенствования производственных навыков работников.”*

А цяпер па пунктах. У чым, хто можа адказаць, выявілася на нашым заводзе, асабліва ў гуце, “змяншэнне працаёмкасці ў выніку агульнага паляпшэння арганізацыі вытворчасці і працы”? Можа, ў тым, што абсталяванне (станкі) і інструменты (трубкі, пінцы-нажніцы-катальнікі) навейшай канструкцыі? Не. Наадварот, станкі знаходзяцца ў такім стане, што могуць разваліцца ад вібрацыі, бо няма чым замяніць разбітыя падшыпнікі, старыя інструменты і прылады рамантуюць, перарабляюць, латаюць, бо няма матэрыялаў, каб зрабіць новыя. Кожны гутняк можа дадаць сюды сваю праблему, але агульны адказ будзе – “не”, ніякага паляпшэння і блізка няма.

Пра рост прафесійнага майстэрства можна было б казаць, каб работнікам падвышалі кваліфікацыйныя разрады: атрымаў вышэйшы разрад – атрымай і большую норму, праўда, па вышэйшым разрадзе і заробак будзе большым. А, мяркуючы па тым, як у нас падвышаюць нормы, то майстэрства з кожным годам усё расце. Невядома, ці ёсць якая мяжа ў гэтага “росту”? Тое самае можна сказаць і пра вытворчыя навыкі: удасканальванне не можа быць бясконцым.

Таму адзінымі прымальнымі ўмовамі, на падставе якіх можа адбывацца падвышэнне нормаў на нашым прадпрыемстве, могуць быць толькі тэхнічнае і тэхналагічнае удасканальванне, чаго мы і блізка не назіраем.

Але ёсць адна сапраўдная прычына (праўда, яе адкрыта не называюць), чаму падвышаюцца нормы: гэта змяншэнне сабекошту прадукцыі. Хтосці спытаецца, што тут да чаго? Але сувязь відавочная. У нашай сістэме аплаты працы ўсё ўзаемазвязанае: тарыфная стаўка, нормы і расцэнкі. І калі тарыфная стаўка застаецца нязменнай, то пры падвышэнні нормаў змяншаецца расцэнка. У выніку, за той самы аб’ём працы работнік зарабляе менш (ці, па іншаму, за тыя ж грошы трэба працаваць больш). Элементарнае абясцэньванне працы людзей. І, што самае прыкрае, ўсё гэта адбываецца са згоды прафкаму, які павінен усімі законнымі сродкамі абараняць правы і інтарэсы рабочых.

**_Яська Нязгодны_**

# ФПБ - гэта «пераважная сіла» або Загнаныя ў прафсаюзы?



Старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі (ФПБ) Леанід Козік у сваім нядаўнім інтэрв'ю заявіў аб тым, што ФПБ «пераважная сіла» і толькі з ёй трэба лічыцца, а з меркаваннем незалежных прафсаюзаў лічыцца няма неабходнасці. Ён таксама негатыўна ацаніў актыўнасць Беларускага прафсаюза работнікаў РЭП, які стаў на абарону звольненага з БелАЗа грузчыка Юрыя Лобана.

Паводле слоў Леаніда Козіка, членаў ФПБ сотнямі тысяч звальняюць ў сувязі з заканчэннем кантракту, і гэтыя звальненні законныя.

Дазвольце, а як можна станоўча ацэньваць працу ФПБ? Бо менавіта пасля таго, як яе ўзначаліў Леанід Козік, практычна ўся працоўная рэспубліка «пастаўленая ў позу» гэтымі кароткатэрміновымі кантрактамі. Людзей «пераканалі» ў тым, што неўпэўненасць у заўтрашнім дні, боязь страціць працу, згода з незаконнымі прэтэнзіямі начальніка,ператварэнне працоўных у бязмоўных рабоў - гэта іх натуральны стан. І ўсё гэта адбывалася і адбываецца пры ўсвядомлена маўклівай згодзе ФПБ.

Па ўсёй верагоднасці, чыноўнікі з ФПБ і большасці галіновых прафсаюзаў не нацешацца з такіх вынікаў дзесяцігадовага тэрміну дзеяння кантрактнай сістэмы ў Беларусі. Бо з іх падачы кантрактная сістэма атрымала сваё развіццё, але ўжо на прафсаюзнай ніве. Бо ўладкавацца на працу чалавек можа толькі пасля папярэдняга ўступлення ў дзяржаўны прафсаюз. Права кожнага грамадзяніна ўступаць яму ў прафсаюз або не, а калі ўступаць, то ў той, які ён хоча, не дзейнічае. Ёсць абавязак - ўступіць у прафсаюз ФПБ.

Адсюль і наплявацельскае стаўленне прафсаюзнай вярхушкі да патрэбаў і клопатаў простага чалавека. Бо прафсаюзная дзейнасць ФПБ пастаўленая так, што ад меркавання радавога чалавека ўжо даўно нічога не залежыць. Галоўнае, каб ішлі прафсаюзныя ўнёскі. І яны рэгулярна ідуць.

Эканамічны крызіс закрануў кожнага працоўнага, але не прафсаюзных функцыянераў, якія ўваходзяць у ФПБ. Бо ў іх заработныя платы не прывязаныя да сярэдняй заработнай платы рабочага, інжынера, лекара, настаўніка. Ўзровень заработнай платы вызваленых старшыняў прафкамаў залежыць, як правіла, ад памеру зарплаты галоўнага інжынера або намесніка дырэктара. У кіраўнікоў галіновых прафсаюзаў ўзровень заработнай платы залежыць ад ўзроўню аплаты працы высокапастаўленых дзяржаўных чыноўнікаў адпаведных міністэрстваў і ведамстваў і гэтак далей. Дык адкуль у іх возьмецца цікавасць, каб расла заработная плата радавых членаў прафсаюза? Адным словам, працуй, рабочы клас, а мы прыкладзем усе намаганні, каб абараніць кіраўнікоў прадпрыемстваў, кіраўніцтва краіны ад тваіх законных патрабаванняў.

А ўся так званая аптымізацыя кантрактнай сістэмы, якую ставіць сабе ў заслугу кіраўніцтва ФПБ, тычыцца ці падаўжэння кантракту да 5 гадоў з жанчынамі, якія знаходзяцца ў водпуску па догляду за дзіцём, альбо з работнікамі перадпенсійнага ўзросту, якім да пенсіі засталося тры або менш гадоў -- нішто іншае, як глянец на іржы. Гэтая аптымізацыя не вырашае галоўную праблему. Добрасумленны работнік павінен працаваць па безтэрміновай працоўнай дамове і не залежаць ні ад настрою начальніка, ні ад меркавання ідэолагаў, а залежаць толькі ад свайго прафесіяналізму і кваліфікацыі. Так ужо было ў Беларусі. Так ёсць у Расіі. Так будзе і ў нас.

Такое доўгае прымяненне кароткатэрміновых кантрактаў штучна размежавала работнікаў на тры групы: на набліжаных да начальства і "заискивающих" перад ім, на "неблагонадежных", якія маюць свой, адметны ад афіцыйнага, пункт гледжання на падзеі, якія адбываюцца на вытворчасці і ў краіне, і, нарэшце, на цярплівую, маўклівую, пераважную большасць.

Гэта значна горш, чым любы эканамічны крызіс. Рана ці позна крызіс заканчваецца, і абноўленая эканоміка ўздымаецца з каленяў. А вось вяртанне даверу людзей - працэс больш сур'ёзны і доўгі. Парушыўшы кантрактнай сістэмай павагу да чалавека працы, практычна знішчыўшы рабочую салідарнасць і ўзаемадапамогу, ушчэнт выкараніўшы працоўны і агульначалавечы гонар за сябе і сваё прадпрыемства, немагчыма ўсвядомлена з'яднаць працоўны калектыў на рашэнне складаных задач нават на асобна ўзятым прадпрыемстве, не кажучы ўжо пра краіну ў цэлым.

Краіну з выдатным працоўным патэнцыялам ператварылі ў краіну з разарванай рабочай душой.

На думку старшыні ФПБ Л. Козіка, сотні тысяч людзей звальняюць і нічога страшнага не адбываецца. А тут за аднаго працоўнага шум паднялі.

Не, спадар Козік, не за аднаго Юрыя Лобана мы сталі на абарону. А за кожнага, хто хоча адстойваць свае законныя правы, хто хоча перамагчы ў сабе страх, хто хоча з годнасцю насіць імя Працоўнага і быць упэўненым у сваёй будучыні і будучыні сваіх дзяцей.

І сёння не сакрэт, што калі ў працоўных ўзнікаюць праблемы, звязаныя з працоўнымі адносінамі, яны шукаюць шляхі да незалежных прафсаюзаў, загадзя ведаючы, што структуры ФПБ не акажуць ім неабходнай дапамогі. Так было на прадпрыемствах «Мастыдрэў», «Савушкін прадукт», «БелАЗ», шклозавод «Нёман», так рабілі і работнікі сістэмы аховы здароўя, настаўнікі, прадаўцы.

І такіх людзей з кожным днём становіцца ўсё больш і больш. Гэта нават заўважна па тых тэлефонных званках ў офіс прафсаюза, у тым ліку з «БелАЗа». Мы не плачам - мы аб'ядноўваемся! Бо перамога не за тымі у каго «пераважная» сіла, а за тымі, у каго праўда.

***Генадзь Фядыніч,***
***старшыня прафсаюза РЭП***

ПРАЦОЎНАЯ САЛІДАРНАСЦЬ

## Дапамогі па безпрацоўю

У нашых суседзяў, у Літве і Польшчы, дапамога па безпрацоўі большая, чым заробкі ў Беларусі.

Паводле інфармацыі упраўлення занятасці камітэту па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, безпрацоўныя ў мінулым месяцы атрымалі ў сярэднім па 33 тысячы рублёў дапамогі.

А ў Літве дапамога па безпрацоўю складае, ў залежнасці ад стажу, ад 100 да 300 еўра (сярэдні памер дапамогі – каля 200 еўра).

Падобная сістэма дзейнічае і ў Польшчы. Там безпрацоўныя могуць разлічваць у сярэднім на 140 еўра штомесяц. Таксама ў Польшчы безпрацоўныя прыцягваюцца на грамадзкія работы, пры гэтым за кожную гадзіну такіх работ ім плоцяць дадаткова 6,8 злотых (больш за 2 долара).

А ў Беларусі грамадзія работы з’яўляюцца для безпрацоўных абавязковымі, і аплата за іх не прадугледжаная. Мабыць, нашыя чыноўнікі лічаць, што 33 тысячы рублёў – дастатковая сума для безпрацоўнага.

• • • • • • • •

## На апазіцыю ціснуць

Шасці настаўнікам са школаў Мінскай вобласці пагражаюць звальненнем з працы. Прычына –прыналежнасць да апазіцыйнай партыі. 16 студзеня яны былі выкліканыя начальнікам Мінскага абласнога ўпраўлення адукацыі – Таісіяй Данілевіч.

Сярод выкліканых – настаўніца гісторыі Наталля Ільініч з вёскі Талька Пухавіцкага раёну Мінскай вобласці. Ёй пагражае звальненне з працы за яе прыналежнасць да партыі БНФ. “Сказалі да панядзелку напісаць заяву аб сыходзе з партыі БНФ, альбо заяву аб сыходзе з працы,” - кажа Наталля Ільініч.

- Выклікалі і сварыліся ў брутальнай форме, маўляў, БНФ - апазіцыйная партыя, дык чаго вы тады ў дзяржаўнай школе працуеце, грошы вам дзяржава плаціць, значыць, вы павінны праводзіць ідэалогію дзяржавы. Безумоўна, мне хочацца працу захаваць, няма другіх крыніц жыцця, таму што ў вёсцы, ведаеце, у нас нават і калгаса няма, каб пайшоў у другое месцы куды, але ж і годнасць сваю захаваць трэба. Вось у такім становішчы я.

Як сказала Наталля Ільініч, ёй далі час прыняць рашэнне да панядзелку. У сераду начальнік РАА мае прывезці копію пратакола аб яе зыходзе з партыі. У іншым выпадку будзе звольнена з працы.

***Радыё Рацыя.***

## Мінімальны заробак падвысілі

У Беларусі з 1 студзеня 2010 года павялічылася мінімальная заработная плата да 258 тыс. 600 рублёў (каля 63 еўра).

Такое рашэнне прынята пастановай Савета Міністраў ад 26 снежня 2009 года № 1700.

З 1 студзеня 2009 года ў краіне мінімальная заработная плата раўнялася 229 тыс. 700. рублям.

У адпаведнасці з пастановай № 1700 мінімальны заробак у гадзіну ўстаноўлены ў памеры 1 530 рублёў (37 еўрацэнтаў).

Для параўнання: сярэдняя аплата працы ў краінах Еўрасаюзу вагаецца ад 6 да 12 еўра за гадзіну.

“За сильную и процветающую Беларусь?”

## Аднавілі на працы праз суд

Кіраўнік пярвічнай арганізацыі Свабоднага прафсаюза Беларускага працаўнікоў Лукомскай ГРЭС адноўлены на працы пастановай суда.

Увосень наймальнік не працягнуў з ім кантракт. І хаця фармальна дзеянні наймальніка мелі законныя падставы – бо Аляксей Габрыэль з’яўляецца пенсіянерам, яму 61 год, – у судзе было даказана, што сапраўднай прычынай звальнення з’яўляецца актыўная прафсаюзная дзейнасць звольненага.

18 снежня суд прыняў вырашэнне на карысць Аляксея Габрыэля, упершыню ў Беларусі прызнаўшы факт дыскрымінацыі па прызнаку дзейнасці ў незалежным прафсаюзе. З 1 студзеня з ім падпісаны кантракт тэрмінам на 1 год.

***Паводле “Салідарнасць”***

***У Вас праблемы з наймальнікам?***
***Вы лічыце, што Вашыя правы парушаюцца?***
***Напішыце нам на адрас электроннай пошты:***
***hutanioman@gmail.com***
***Кваліфікаваныя юрысты незалежных прафсаюзаў разгледзяць Вашу сітуацыю і пракансультуюць Вас.***
***Бясплатна!!!***

**Працоўная салідарнасць**
*Інфармацыйна-аналітычнае выданне*
*г.Бярозаўка*
*Рэдактар і выдавец П.Кілішкевіч*

*Распаўсюджваецца бясплатна*
*Наклад 299 экз.*
*Друкарня “Вольны працаўнік”*
*Адказны за выпуск Л.Някозік*
*E-mail: hutanioman@gmail.com*